Источник: "Рэспубліка" - 2017-11-04

ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА

## Быць ці не быць арыгінальным лекам

# ТАБЛЕТКА З ПРЫЕМНЫМ СМАКАМ



**Палова лекаў, якія прадаюцца на ўнутраным рынку, беларускія. Але па-сапраўднаму нашых прэпаратаў у іх ліку малая доля. У асноўным гэта джэнерыкі – аналагі замежных лекаў, выраблены на аснове імпартных субстанцый. А што будзе далей? Такім пытаннем задаліся вучоныя на сустрэчы з журналістамі.**

— Навукоўцы шмат працавалі, — падводзіць вынікі дырэктар Інстытута фізіка-арганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Більдзюкевіч. — У асноўным з набытых субстанцый былі створаны айчынныя лекавыя сродкі па больш нізкай цане.

А што ж далей? Гэтае пытанне цікавіць распрацоўшчыкаў прэпаратаў.

Аляксандр Віктаравіч бачыць выхад у далейшым развіцці замежных аналагаў, а таксама ў распрацоўцы новых арыгінальных сродкаў, якіх няма ў свеце. Аднак менавіта тут вучоныя ўпіраюцца ва ўмовы, якія спыняюць іх у пачатку шляху.



Аляксандр БІЛЬДЗЮКЕВІЧ.

— Задача вельмі складаная, — разважае Аляксандр Більдзюкевіч. — Нас паставілі ў такія рамкі па часе, якія ва ўсім свеце лічацца нерэальнымі. Цыкл стварэння арыгінальнага прэпарата — 10—12 гадоў. Нам столькі не даюць. Кошт такой працы вельмі вялікі. Але калі арыгінальны прэпарат будзе створаны, грошы «адаб'юцца». Менавіта таму буйныя фармкампаніі ажыццяўляюць моцнае фінансаванне падобных распрацовак.

Аляксандр Більдзюкевіч лічыць, што ўсе лекі важныя. Усе захворванні, што існуюць, неабходна лячыць і шукаць новыя сродкі, якія могуць выратаваць ад хваробы. І тут мала адной толькі ідэі. Да праблемы трэба падыходзіць сістэмна:

— Арыгінальная распрацоўка можа вытрымаць даклінічны этап і не вытрымаць потым выпрабавання на пацыентах. І мы пастаўлены ў такія ўмовы, што павінны вярнуць сродкі, якія былі затрачаны да гэтага этапу. Заўсёды існуе высокая ступень рызыкі. Атрымліваецца, што мы не маем на гэта права. Вядома, што віягра першапачаткова распрацоўвалася для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў. Аднак гэтыя здагадкі на практыцы не спраўдзіліся. Вучоныя не спыніліся. І сёння гэты прэпарат прадаецца на мільярды долараў. Калі б гэта рабілі ў нашых умовах, то распрацоўшчыкі вымушаны былі б аддаць сродкі за тое, што гіпотэза, якая была ў пачатку, не пацвердзілася.

Трэба звярнуць увагу на яшчэ адну акалічнасць: тэхналагічны прагрэс за мяжой вельмі высокі. І, нягледзячы на рэканструкцыю некаторых прадпрыемстваў, замежныя кампаніі для ўзаемадзеяння агучваюць свае патрабаванні па пераабсталяванні.

**Вольга АНАТОЛЬЕВА**

Вольга Анатольева. Таблетка з прыемным смакам